Ладысеў, У.Ф. Да пытання аб расійскім фактары станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці / У.Ф. Ладысеў // Працы гістарычнага факультэта : навук. зб. Вып. 1 / рэдкал. : У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БДУ, 2006. — С. 39–45.

***У. Ф. ЛАДЫСЕЎ***

# ДА ПЫТАННЯ АБ РАСІЙСКІМ ФАКТАРЫ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці праходзіў надзвычай складана. На сённяшні дзень большасць беларускіх гісторыкаў зыходзяць з метадалагічнага тэзіса, што абвяшчэннем БНР пытанне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці было пастаўлена ў парадак дня палітычнага жыцця Беларусі. Аднак станаўленне рэальнай беларускай дзяржаўнасці звязана з утва-



рэннем Савецкай сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. Прычым ён праходзіў не менш складана і драматычна, чым БНР.

Тым не менш у беларускай гістарыяграфіі ўсталяваўся некалькі спрошчаны падыход да праблемы ўтварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове, які не ўлічвае асаблівасцей палітыкі ўрада РСФСР да нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў заходнім нацыянальным рэгіёне былой Расійскай імперыі. Ён быў прадыктаваны як бягучымі, кан'юнктурнымі палітычнымі меркаваннямі, так і доўгатэрміновымі перспектыўнымі эканамічнымі і палітычнымі задачамі.

Неабходна адзначыць, што ўладныя структуры РСФСР на працягу лета — восені 1918 г. не ішлі далей пазіцыі абласніцтва ў вырашэнні нацыянальнага пытання. Так, адміністрацыйная камісія УЦВК РСФСР прапанавала на тэрыторыі былой царскай Расіі ліквідаваць усялякі нацыянальны падзел і стварыць акрамя Маскоўскай яшчэ тры вобласці (камуны): Заходнюю, Паўночную і Уральскую. Заходнюю вобласць меркавалася стварыць у складзе Смаленскай, Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай, Чарнігаўскай, Віленскай і Ковенскай губерняў з абласным цэнтрам у Мінску. Такой пазіцыі прытрымліваліся кіраўнікі Паўночна-Заходняга абкома РКП(б) і Аблвыкамзаха на чале с А. Ф. Мясніковым, М. І. Калмановічам і інш., што знаходзіліся ў Смаленску.

Таму прынятыя канферэнцыяй беларускіх секцый РКП(б) рашэнні (адбылася 21—23 снежня 1918 г. у Маскве) аб неабходнасці стварэння Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі і скліканні ўсебеларускага з'езда камуністаў у мэтах арганізацыі нацыянальнага партыйнага цэнтра фактычна паставілі ЦК РКП(б) перад неабходнасцю вырашыць праблему беларускай дзяржаўнасці. 24 снежня праблема дзяржаўнасці Беларусі была разгледжана ЦК РКП(б).

На сённяшні дзень застаецца адкрытым пытанне, на якім узроўні прымалася рашэнне ў Цэнтральным камітэце РКП(б). Аўтары «Гісторыі Беларусі», ч. II, Мн., 1998 (пад рэд. прафесараў Я. К. Новікава і Г. С. Марцуля) памылкова сцвярджаюць аб пленуме ЦК РКП(б), які адбыўся 24 снежня 1918 г. Дакументальнага пацвярджэння аб пасяджэнні ЦК РКП(б) 24 снежня таксама не выяўлена. Хутчэй за ўсё старшыня Наркамнаца РСФСР І. Сталін у сваей размове па тэлефоне з А. Мясніковым 25 снежня, спасылаючыся на рашэнне ЦК, выконваў асабістае ўказанне У. Леніна па беларускім пытанні, якое было прынята шляхам апытання членаў ЦК па тэлефоне, як тады нярэдка практыкавалася.

На сустрэчах 25 снежня І. Сталіна з З. Жылуновічам, І. Дылам і інш. адказнымі супрацоўнікамі Белнацкама і беларускіх секцый РКП(б), а 27 снеж-



ня з Мясніковым і Калмановічам былі вызначаны паўнамоцтвы і склад будучага ўрада, акрэслена тэрыторыя рэспублікі ў складзе пяці губерняў (Гродзенская, Мінская, Магілёўская, Віцебская і Смаленская).

У сувязі з тым, што ў парадку дня VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б), якая пачала работу 30 снежня ў Смаленску, пытанне аб дзяржаўнасці Беларусі не значылася, у даклад А. Мяснікова па пытанні «Бягучы момант» быў уключаны пункт «Беларуская Савецкая Рэспубліка». Ён змяшчаў прапанову «абвясціць Заходнюю Камуну самастойнай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікай». У якасці аргумента вылучаўся міжнародны фактар «замкнуць ланцуг самавызначаўшыхся ўтварэнняў» [1, 13]. Дэлегаты пагадзіліся з такой прапановай і без абмеркавання аднагалосна прынялі яе (пяць устрымалася). Лагічней было б лічыць дату нараджэння рэспублікі 30 снежня, а не 1 студзеня — дзень абнародавання Маніфеста. У пастанове аб тэрыторыі рэспублікі асноўным ядром яе лічылася Мінская, Смаленская, Магілёўская, Віцебская і Гродзенская губерні з прылеглымі да іх мясцовасцямі суседніх губерняў, населеных пераважна беларусамі.

Аднак і пасля гэтага пытанне аб беларускай дзяржаўнасці не было знята з парадку дня ні цэнтральнымі партыйнымі і савецкімі органамі ў Маскве, ні на ўзроўні мясцовых партыйных арганізацый. Яно набывала ўсё больш драматычны характар.

І. Сталін, які неаднаразова асабіста ўладжваў канфлікты, у прыватнасці 31 снежня і 1 студзеня 1919 г. паміж А. Мясніковым, З. Жылуновічам і іх прыхільнікамі па складу будучага Часовага ўрада Беларусі, меў намер прыехаць у Мінск, але быў вымушаны адмовіцца ад гэтага плана. 2 студзеня 1919 г. ён тэлеграфуе Мяснікову і Калмановічу, што адкладвае сваю паездку ў Мінск на 10 дзён, бо па прапанове ЦК РКП(б) спешна выязджае на Усходні фронт у сувязі з крытычнай сітуацыяй, якая склалася там. «Праз 10 дзён, — сказаў далей Сталін, — буду ў Вас, вядзіце сябе спакойна і не біцеся, а то будзе дрэнна» [2, 1].

Парада была не выпадковая, бо немнагаслоўны Сталін ведаў больш, чым казаў. Прычым Сталін затрымаўся на фронце не на дзесяць, а больш чым на дваццаць дзён.

У яго адсутнасць адбыліся падзеі, якія карэнным чынам паўплывалі на дзяржаўнасць Беларусі. 16 студзеня 1919 г. пленум ЦК РКП(б) прыняў адмоўнае для беларускай дзяржаўнасці рашэнне: забраць у толькі што створанай Беларускай рэспублікі Віцебскую, Магілёўскую і Смаленскую губерні і ўключыць іх у склад РСФСР, пакідаючы ў складзе Беларусі Мінскую і Гродзенскую. Я. Свярдлоў уласнаручна дапісаў пункт 7 пастановы, які прадпісваў вынесці на з'езд Саветаў Беларусі рашэнне аб аб'яднанні з Літвой [3, 1].



У беларускай гістарыяграфіі існуе спрошчаны погляд, што гэтае рашэнне было прадыктавана прычынамі знешнепалітычнага характару — наступленнем войск Польшчы. Аднак наступленне польскіх войск пачалося пазней, 14 лютага 1919 г. Да апошняга часу беларускія гісторыкі не ведалі аб існаванні дакументаў Асобнай нарады па пытанні ўтварэння Беларускай рэспублікі, якія акцэнтуюць увагу даследчыкаў на прычыны ўнутрыпалітычнага, эканамічнага характару.

Асобная нарада была створана ў адпаведнасці з пастановай УЦВК ад 23 снежня 1918 г. пры Народным камісарыяце дзяржкантролю Расійскай Федэрацыі ў сувязі з утварэннем Латвійскай, Эстонскай і Літоўскай савецкіх рэспублік і прызнаннем іх незалежнасці. Галоўная ўвага была сканцэнтравана на забеспячэнні інтарэсаў Расіі, на эканамічных выніках, што выцякалі з усталявання новай пагранічнай лініі паміж РСФСР і ўтворанымі прыбалтыйскімі рэспублікамі. Асобна падкрэслівалася неабходнасць для Расіі «доступу да партоў Балтыйскага мора».

У адрозненне ад прыбалтыйскіх рэспублік, утварэнне беларускай дзяржаўнасці выклікала адмоўную рэакцыю ўдзельнікаў нарады як з пункту гледжання яе аб'ектыўнай абумоўленасці, так і фінансава-эканамічных адносін. Так, на пасяджэннях нарады ад 4 і 14 студзеня ў выніку абмеркавання беларускага пытання яго ўдзельнікі прыйшлі да вываду, што «для ўтварэння незалежнай ад Расіі Беларусі высноў не маецца» [4, 21]. Матывіроўкі для такой высновы гістарычнага, фінансава-эканамічнага і палітычнага характару былі затым сфармуляваны ў спецыяльным дакладзе аб эканамічным становішчы Беларусі, у якім падкрэслівалася, што «адсутнічаюць высновы для ўтварэння не толькі самастойнай Беларускай рэспублікі, але нават штата, як часткі федэратыўнага арганізма з моцна развітай эканомікай» [4, 11].

Матэрыялы нарады з'явіліся своеасаблівым тэарэтычным падмуркам для прыняцця вышэйпрыведзенага рашэння пленума ЦК РКП(б). Яно было прадыктавана ў першую чаргу прычынамі ўнутрыпалітычнага, эканамічнага характару. Ва ўмовах грамадзянскай вайны, якая пачалася, пераходу да палітыкі харчразвёрсткі асноўнай праблемай для савецкай улады была харчовая. Выпадзенне з гаспадарчага разліку трох губерняў — Смаленскай, Віцебскай і Магілёўскай — стварала дадатковыя цяжкасці для функцыяніравання традыцыйных гаспадарчых сувязей заходніх губерняў з Цэнтрам.

Для правядзення ў жыццё рашэння пленума ў Беларусь камандзіраваўся ўпаўнаважаны ЦК РКП(б) Ад. Іофе, які планаваўся на пасаду старшыні ЦВК ЛітБела.

Супраць штучнага дзялення этнічнай Беларусі пратэставалі не толькі група З. Жылуновіча, але А. Мяснікоў і яго прыхільнікі. Аб гэтым сведчыць



пратакол пасяджэння Цэнтральнага бюро КП(б)Б ад 22 студзеня, на якім прысутнічаў Іофе. Усе 8 членаў Бюро адхілілі прапанову Іофе аб падзеле тэрыторыі рэспублікі і вырашылі звярнуцца ў ЦК РКП(б) з просьбай перарашыць пытанне аб усходніх губернях Беларусі [5, 20—21].

Таму Іофе ў пісьме Свярдлову ад 28 студзеня адзначыў, што абедзве групы нікуды не вартыя. Беларусы, ці група Жылуновіча, — нацыяналісты, а Мяснікоў і яго прыхільнікі, хаця не нацыяналісты, але сепаратысты яшчэ горшай маркі. І раіў разагнаць іх, паслаць на працу куды-небудзь далей ад Беларусі.

Аднак ідэя дзяржаўнасці Беларусі знаходзіла ўсё большую колькасць сваіх прыхільнікаў і сярод савецка-партыйнага актыву былой Паўночна-Заходняй вобласці. Гэтыя настроі яскрава выявіліся на Мінскай губернскай партыйнай канферэнцыі, якая адбылася ў канцы студзеня 1919 г. У прынятай рэзалюцыі канферэнцыі за подпісамі членаў Бюро І. Рэйнгольда, Р. Найдзенкава і В. Кнорына выказваўся недавер

прадстаўніку ЦК РКП(б) Іофе, змяшчалася патрабаванне адзыву з Беларусі. Сур'ёзныя папрокі ў адміністраванні былі зроблены і ў адрас Свярдлова.

Такая пазіцыя савецка-партыйнага кіраўніцтва Беларускай рэспублікі вызвала сур'ёзны непакой у ЦК РКП(б). Урэгуляванне канфлікту было ўскладзена на Сталіна, які ад імя Цэнтральнага камітэта РКП(б) адобрыў дзейнасць Іофе ў Беларусі і патрабаваў ад членаў Цэнтральнага бюро КП(б)Б, якія падпісалі рэзалюцыю, перагледзець свае пазіцыі. У той жа час у тэлефанаграме савецкаму ўраду Літвы паведамляў, што на кандыдатуры Іофе на пасаду старшыні ЦВК ЛітБела «не настойваем, няхай будзе Ціхоўскі».

Невыпадкова, што ў працы І Усебеларускага з'езда Саветаў 2—3 лютага 1919 г. прыняў непасрэдны ўдзел Свярдлоў. З'езд Саветаў прадубліраваў прынятае раней у Маскве рашэнне аб утварэнні Літоўска-Беларускай савецкай Рэспублікі. 27 лютага 1919 г. у Вільні на аб'яднаным пасяджэнні ЦВК Літоўскай і Беларускай ССР было прынята рашэнне аб аб'яднанні рэспублік Літвы і Беларусі.

З утварэннем гэтай штучнай дзяржаўнасці як бы здымалася з павесткі дня пытанне аб правамернасці далучэння этнічных беларускіх зямель да РСФСР.

У склад новага ўрада ЛітБела З. Жылуновіч не ўвайшоў, бо ў пачатку лютага быў накіраваны на журналісцкую працу ў Харкаў. А. Мяснікоў у маі 1919 г. быў камандзіраваны на Усходні фронт у рангу камандуючага Паволжскім фронтам. Яшчэ больш трагічна склаўся лёс Рыгора Паўлавіча Найдзенкава, які на І Усебеларускім з'ездзе Саветаў быў абраны членам ЦВК БССР і яго Прэзідыума, а ў сакавіку членам ЦК КП(б)ЛіБ. У маі 1919 г. паводле пастановы ЦВК ЛітБела быў арыштаваны Вярхоўным рэвалюцый-



ным трыбуналам ЦВК ЛітБела па абвінавачванні ў тым, што выдаваў сябе за члена РСДРП з 1906 г., а адказныя пасады ў Заходняй вобласці выкарыстоўваў для сваёй выгады, і быў расстраляны.

Такі сумны вынік першапачатковага этапу стварэння беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Тагачаснаму савецка-партыйнаму актыву Беларусі быў дадзены прадметны ўрок пралетарскага інтэрнацыяналізму. Ён наклаў свой адмоўны адбітак на пазіцыю кіраўнікоў Мінскага губрэўкома ў ліпені 1920 г., калі ў другі раз вырашалася пытанне аб абвяшчэнні ССРБ і яе тэрыторыі.

Пасля вызвалення 11 ліпеня 1920 г. Мінска, а затым большай часткі тэрыторыі Беларусі ад польскіх войскаў склаліся аб'ектыўныя прадпасылкі для аднаўлення беларускай дзяржаўнасці. Аднак праблема дзяржаўнасці Беларусі для кіраўніцтва Савецкай Расіі і на гэты раз была падпарадкавана ваенна-палітычнай мэце. Аб гэтым сведчыць падпісаны ў Маскве 12 ліпеня 1920 г. мірны дагавор паміж Літвой і РСФСР. Згодна з дагаворам частка этнічнай беларускай тэрыторыі з гарадамі Гродна, Шчучын, Ашмяны, Смаргонь, а таксама Віленскі край з Вільняй былі прызнаны часткай Літвы. Дагавор гарантаваў нейтралітэт Літвы ў ходзе савецка-польскай вайны, бяспеку правага фланга войскаў Заходняга фронту ў яго наступленні на Варшаву.

Для падрыхтоўкі дэкларацыі аб абвяшчэнні ў другі раз беларускай дзяржаўнасці была створана камісія, у склад якой увайшлі 4 прадстаўнікі ад БПС-Р (Я. Бялькевіч, П. Берднік, У. Мамонька і М. Пашковіч), 2 ад КП(б)Б ЛіБ (А. Чарвякоў і В. Кнорын), ад БКА — У. Ігнатоўскі, ад Бунда — А. Вайнштэйн. Ужо на першым сходзе камісіі выявілася, што галоўным разыходжаннем БПС-Р з пазіцыяй камуністаў было пытанне аб межах Беларусі. Прадстаўнікі БПС-Р настойвалі, каб у акце абвяшчэння незалежнасці Беларусі быў ясна акрэслены прынцып этнічнага самавызначэння. Аднак прадстаўнік камуністаў В. Кнорын адказаў, што яны «не могуць дапусціць, каб Смаленская, Магілёўская і Віцебская губерні адышлі да Беларусі, таму што жывуць там рускія людзі і што там няма беларусаў» [6, 14—15]. Прадстаўнікі БПС-Р афіцыйна заявілі, што пад такой дэкларацыяй аб аб'яўленні незалежнасці ССРБ сваіх подпісаў не паставяць, а таксама адмовіліся ўвайсці ў склад Часовага рэвалюцыйнага камітэта.

ЦК КП(б)Б ЛіБ выказаўся за разрыў адносін з беларускімі эсэрамі. Далейшая гістарычная рэчаіснасць паказала шкоднасць такой палітычнай лініі. Ва ўмовах, калі пачаліся перагаворы ў Рызе паміж расійскай і польскай дэлегацыямі аб умовах прэлімінарнага мірнага дагавора, патрэбна была лінія на аб'яднанне палітычных сіл, якія адстойвалі тэрытарыяльную цэласнасць Беларусі.



Таму невыпадкова беларуская нацыя і яе этнічная тэрыторыя пасля заключэння 18 сакавіка 1921 г. Рыжскага дагавора аказалася раздзеленай на доўгі час на тры часткі. Як суверэнная дзяржава Беларуская рэспубліка існавала пасля другога абвяшчэння ў межах толькі шасці паветаў былой Мінскай губерні (Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, часткова Мінскі і Слуцкі). Яе плошча складала 52,4 тыс. км$^2$, а насельніцтва 1 544 000 чалавек.

Рэальнае жыццё вельмі хутка паказала, што штучны разрыў адзінага этнасацыяльнага арганізма беларускай нацыі з'яўляецца вялікай перашкодай паспяховаму нацыянальна-дзяржаўнаму, эканамічнаму і культурнаму будаўніцтву Беларусі. Толькі ў сакавіку 1924 г. дзякуючы актыўным палітычным намаганням тагачаснага старшыні ЦВК Беларусі А. Чарвякова, старшыні Саўнаркома Яз. Адамовіча, наркома асветы У. Ігнатоўскага і інш. беларускіх палітычных дзеячаў да БССР былі далучаны 8 паветаў Віцебскай і 7 паветаў

Гомельскай, Горацкі і частка Мсціслаўскага павета Смаленскай губерняў. Аднак спатрэбілася яшчэ больш за два гады, каб станоўча, на карысць Беларусі вырашыць пытанне аб далучэнні Гомельскага і Рэчыцкага паветаў у снежні 1926 г. У выніку тэрыторыя Беларусі склала 125 590 км$^2$ з насельніцтвам каля 5 млн чалавек. Фактычна палова беларускага этнасу стала пражываць у Савецкай Беларусі. Вяртанне БССР тэрыторый на ўсходзе ўяўляла сабою важны этап у складаным працэсе аб’яднання беларускай нацыі, значна ўзмацніла эканамічны патэнцыял Савецкай Беларусі, павысіла яе вагу ў грамадска-палітычным жыцці тагачаснага СССР.

Такім чынам, працэс станаўлення дзяржаўнасці Беларусі быў надзвычай складаны і супярэчлівы, абумоўлены прычынамі геапалітычнага і эканамічнага характару. Цэнтральную ролю ў станаўленні беларускай дзяржаўнасці адыграла імкненне кіраўніцтва Савецкай Расіі стварыць на заходніх рубяжах своеасаблівы бар’ер з нацыянальных савецкіх рэспублік, а таксама актыўныя дзяржаваўтваральныя дзеянні беларускіх нацыянал-камуністаў З. Жылуновіча, А. Чарвякова, У. Ігнатоўскага і інш.

## ЛІТАРАТУРА


1. Пратакол І з’езда Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. Менск, 1934.
2. Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ). Ф. 3, воп. 1, спр. 4671.
3. РДАСПГ. Ф. 17, воп. 2, спр. 8.
4. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. 4390, воп. 2, спр. 61.
5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 4, воп. 1, спр. 1.
6. Бюлетэнь загранічнай групы Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. 1926. № 3—4 (студз. — сак.).